УДК 821.161.3+398.21

**С. В. Шамякіна** (Мінск)

# КАЗАЧНЫЯ АПОВЕСЦІ П. ВАСЮЧЭНКІ “ЖЫЛІ-БЫЛІ ПАНЫ КУБЛІЦКІ ДА ЗАБЛОЦКІ” І НАРОДНЫЯ КАЗКІ

Выкарыстанне фальклорных матываў і вобразаў шырока распаўсюджана ў мастацкай літаратуры з часоў уласна яе ўзнікнення. І народныя казкі бадай што найбольш часта з’яўляюцца крыніцай запазычання прыгожым пісьменствам разнастайных элементаў і мастацкіх сродкаў. Так, адзін з самых старажытных літаратурных твораў, вядомых навукоўцам, – егіпецкая “Казка пра двух братоў”, створаная на аснове фальклорнага матэрыялу. “Казка пра Амура і Псіхею”, што ўваходзіць у склад рамана Апулея “Залаты асёл” і лічыцца адной з першых літаратурных казак, бо ў яе вядомы аўтар, таксама заснавана на калектыўнай народнай творчасці. Дадзеная традыцыя працягваецца і далей, назіраецца ў аўтараў розных часоў, у тым ліку і сучасных. Выразна прасочваецца яна і ў творы беларускага пісьменніка П. Васючэнкі “Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі”.

Але ж выкарыстоўваючы фальклорны матэрыял, аўтары літаратурных твораў змяняюць яго; вобразы, матывы, сюжэты і іншыя мастацкія элементы трансфармуюцца рознымі спосабамі. Так і ў дадзеным артыкуле творы П. Васю-

чэнкі назіраюцца як рысы, падобныя да тых, што прадстаўлены ў народных казках, так і разнастайныя змяненні і дапаўненні – аналіз тых і другіх аспектаў і з’яўляецца мэтай нашай работы.

Элементы, што маюць паралелі з народнымі казкамі, у творы “Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі”, на наш погляд, можна аб’яднаць у некалькі груп.

**1. Вобразы-персанажы.**

Галоўнымі героямі ў творы П. Васючэнкі з’яўляюцца два паны – Кубліцкі і Заблоцкі. Асноўныя характарыстыкі дадзеных персанажаў – лянота, дурасць, фанабэрлівасць, няўменне нічога рабіць самастойна і г.д. – цалкам адпавядаюць вобразам паноў з многіх народных сацыяльна-бытавых казак [5].

У самым пачатку твора аўтар падкрэслівае, што паны Кубліцкі і Заблоцкі – шырока вядомыя ў народзе асобы, пра якіх людзі распавядаюць розныя гісторыі, такім чынам персанажы нібыта ўключаюцца ў фальклорны кантэкст.

Сюжэты казачных аповесцей П. Васючэнкі заснаваны на тым, што паны (часцей за ўсё з-за сваіх адмоўных рыс) трапляюць у розныя смешныя і недарэчныя сітуацыі, што таксама з’яўляецца адным з найбольш частых матываў у фальклорных сацыяльна-бытавых казках і анекдотах.

Згодна тэорыі даследчыка Ю. Юдзіна, усіх персанажаў бытавых казак можна звесці да двух тыпаў: дурань і хітруган [8]. Паны Кубліцкі і Заблоцкі маюць рысы абодвух тыпаў. Часцей за ўсё яны трапляюць у недарэчныя сітуацыі па прычыне свайго глупства, ляноты, хцівасці і г.д. (напрыклад, не маюць ежы, бо праігралі ўсё сваё дабро і вымушаны варыць і есці ўласныя боты; аказваюцца разам са сваёй хатай пад зямлёй з-за надта доўгай гульні ў карты; нават выседжваюць яйка, з якога выводзіцца пачварны Цмок і інш.). Але ў некаторых главах паны паводзяць сабе даволі спрытна. Напрыклад, пайшоўшы на заробкі да багатага пана Кіндзюшкі, яны з-за няўмення працаваць страчваюць яго маёмасць, але выходзяць сухімі з вады дзякуючы хітрым прыдумкам.

Другараднымі персанажамі ў творы П. Васючэнкі з’яўляюцца сяляне – дзеўка Дрыпа, бабка Параска, Ахрэм Верацённік. Дадзеныя героі, як і ў народных казках, прадстаўлены больш разумнымі і ў цэлым пазітыўнымі: яны ўмеюць працаваць, больш проста знаходзяць выхад з цяжкага становішча і г.д.

Усе адзначаныя вышэй аспекты стасуюцца з традыцыйнымі фальклорнымі, але ёсць у разглядаемым творы таксама і элементы, што адрозніваюць яго ад народных казак.

У першую чаргу трэба адзначыць *псіхалагізм*. Псіхалагічныя партрэты персанажаў, матывіроўкі іх паводзін, цікаўнасць да душэўных перажыванняў і памкненняў – рыса, што яскрава адрознівае пісьменніцкую казку ад народнай, у якой персанажы з’яўляюцца стабільнымі, замацаванымі традыцыяй тыпамі без псіхалагічных характарыстык. У творы “Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі” мы таксама назіраем намнога больш дэталёвую і індывідуалізаваную псіхалагічную абмалёўку персанажаў, чым у народных казках. Прычым гэта тычыцца не толькі галоўных герояў, але і другарадных.

Так, акрамя ляноты, дурноты, ганарлівасці – рыс агульных і традыцыйных для фальклорных вобразаў паноў, мы таксама можам вылучыць адрозненні ў характарах Кубліцкага і Заблоцкага: першы – больш далікатны, выхаваны і асцярожны, другі – больш актыўны, агрэсіўны, смелы. Дадзеныя рысы падкрэсліваюцца і ў мове персанажаў, што таксама нехарактэрна для народных казак. Напрыклад, у главе “Як паны хадзілі паганага Цмока ваяваць” пан Заблоцкі гаворыць пра Цмока: “*Раскірэка чортава, недаверак гэты! Рэпу павырываў, каб*

*яму зубы павырывала!...*” [1, с. 33] і г.д. Насуперак Заблоцкаму пан Кубліцкі звяртаецца да Цмока ветліва: “*Гэтак, як пан Цмок робіць, рабіць няможна. Нельга есці чужую рэпу ды ясных паненак, і ў статуце гэтак запісана...*” [1, с. 34].

Персанажы-сяляне таксама адзначаюцца большым псіхалагізмам, чым у фальклоры. Асабліва гэта тычыцца дзеўкі Дрыпы, вобраз якой раскрыты ў творы не горш за галоўных герояў. У цэлым падобны тып персанажа характэрны для народных бытавых казак – хітрая і спрытная дзяўчына, якая надта нестандартна выконвае загады паноў, але пры гэтым не атрымлівае ад іх ніякага пакарання. Аднак у фальклоры звычайна ніяк не тлумачацца яе паводзіны, не даецца іх псіхалагічная матывіроўка. У творы ж П. Васючэнкі дзеўка сама тлумачыць асаблівасці свайго характару, папярэджваючы паноў, калі тыя клічуць яе на службу: “*Адно каб паны пасля не шкадавалі. Бо ў мяне ў галаве, ведаеце, фантазіі розныя, лятункі... От як стрэльне што ў голаў, дык усё раблю па-свойму. Натура такая...*” [1, с. 16].

Нават паганы Цмок пасля абразы ад паноў і бабкі Параскі адлятае не проста так, а “плачучы”.

Акрамя таго, некаторыя ўласцівасці персанажаў у творы П. Васючэнкі супярэчаць народным казкам. У апошніх, калі паны ўжо прадстаўлены як носьбіты негатыўных рыс, дык гэтая характарыстыка захоўвацца на працягу ўсяго твора. Паны ж Кубліцкі і Заблоцкі па меры развіцця сюжэту выяўляюць і нешта станоўчае ў сваіх асобах: пачынаюць вучыцца нешта рабіць (вырошчваюць рэпу і г.д.), спрабуюць ваяваць Цмока, ідуць шукаць дзеўку Дрыпу, калі думаюць, што яна згубілася і г.д.

Можна сказаць, што многія персанажы твора “Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі” маюць рысы *трыксцераў*, але намнога больш індывідуалізаваныя і нестандартныя ў параўнанні з фальклорнымі творамі. Падобны тып вобраза (ці нават архетып), на думку многіх даследчыкаў (Я. Касцюхін [4], Д. Гаўрылаў [2] і інш.), з’яўляецца адным з найбольш распаўсюджаных і папулярных на працягу ўсяго развіцця чалавечай культуры. У фальклорных казках усіх жанраў яны таксама пастаянна сустракаюцца – як у сацыяльна-бытавых (і дурні, і хітрацы маюць такія рысы), так і ў чарадзейных (тып героя-“іранічнага шчасліўца”), і ў анімалістычных (на думку Я. Касцюхіна, дадзены жанр увогуле заснаваны менавіта на міфах аб трыксцерах [4]). І П. Васючэнка, завяршаючы свой твор, звяртае ўвагу якраз на падобныя рысы сваіх герояў і асаблівы інтарэс да іх: “*Чаго яшчэ жадаць! Новых прыгодаў! Не турбуйцеся! Яны будуць! З такімі шалапутамі, як вы, яны заўсёды будуць здарацца. Але, можа, за тое я вас і люблю!..*” [1, с. 101].

Акрамя вобразаў розных герояў паасобку, неабходна звярнуць увагу і на ўзаемаадносіны паміж імі, і на сістэму персанажаў твора ў цэлым. Так, у пераважнай большасці народных сацыяльна-бытавых казак галоўнымі героямі з’яўляюцца сяляне, а паны выступаюць як другарадныя персанажы – ў творы П. Васючэнкі ўсё наадварот. Пры гэтым у сацыяльна-бытавых казках адносіны паміж сялянамі і панамі часцей за ўсё дрэнныя. Пра твор жа “Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі” такога нельга сказаць: паны і сяляне тут не варагуюць, паны не робяць сялянам наўмыснай шкоды, сяляне не імкнуцца іх падмануць, ашукаць, а часцей за ўсё, наадварот, дапамагаюць выблытацца з бяды.

**2. Хранатоп.**

Паны Кубліцкі ды Заблоцкі жывуць у нейкі няпэўны час у нявызначанай краіне, падобнай да Беларусі эпохі Сярэднявечча або Новага часу.

Няпэўнасць часу падкрэсліваецца самой назвай твора – выкарыстаннем у ёй тыповага фальклорна-казачнага зачыну *жылі-былі*, што ўказвае менавіта на адноснасць часу (плюсквамперфект дзеяслова).

Акрамя таго, у творы назіраецца пэўнае змяшэнне прыкмет розных эпох. Гаспадарку паны і сяляне вядуць па-сярэднявечнаму, правіць у іх краях нейкі князь Дрыгайла (імя нагадвае князя Свідрыгайла, які жыў у XIV–XV стст.), пан Кіндзюшка назірае за зоркамі ў падзорную трубу (якая была вынайдзена ў XVII ст.), Цмок мае *іншаземны пашпарт* (сістэма пашпартоў пачала актыўна развівацца толькі з XIX ст.) і г.д.

Краіна, у якой адбываецца дзеянне, у творы таксама ні разу не называецца. Тапонімы, якія ўжываюцца ў творы – Еўропа, Мерыка, Ерусалім – дазваляюць лічыць, што апісваецца наш свет, а не нейкі паралельны. Канкрэтна ў краіне, дзе жывуць паны Кубліцкі і Заблоцкі, ёсць горад Смургоні (Смаргонь?) і працякае рака Нёман, што суадносіць дадзеную прастору з Беларуссю. Але ў пэўнай ступені свет у творы ўсё ж альтэрнатыўны – караля суседняй краіны завуць Гарбуз XVIII, над мясцовай рэчкай Парэчкай стаіць Калінавы мост з іншасвету чарадзейных казак.

Такім чынам, і ў гэтым плане казачная аповесць П. Васючэнкі мае як падабенства з народнымі казкамі (няпэўны хранатоп), так і адрозненні (хранатоп няпэўны ў меншай ступені, чым у фальклоры).

**3. Змяшэнне жанраў.**

Народныя казкі ў большасці сваёй маюць традыцыйныя, сталыя жанравыя прыкметы, якія выразна адрозніваюць казкавыя жанры паміж сабою. У творы ж П. Васючэнкі, на наш погляд, назіраецца кантамінацыя элементаў з розных фальклорных жанраў (не толькі казкавых, але ж аб'ектам цікавасці ў дадзеным артыкуле з'яўляюцца менавіта яны). Мы можам вылучыць у творы "Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі" рысы наступных жанраў народных казак:

а) сацыяльна-бытавыя (бытавыя, рэалістычныя) казкі – жанр фальклорнай казкавай прозы, фантастычнасць якога заснавана на паказе незвычайных, дзіўных, але, у прынцыпе, магчымых у жыцці падзей. Дзеянне пабудавана на парушэнні звычайнай логікі, на парадаксальных сітуацыях. Звышнатуральныя сілы, магія адсутнічаюць. Большасць навукоўцаў, якія займаліся вывучэннем дадзенага казачнага жанру (напрыклад, Ю. Юдзін [8], А. Фядосік [6] і інш.), указваюць на яго блізасць да анекдоту. Персанажамі часцей за ўсё з'яўляюцца людзі, пазбаўленыя звышнатуральных рыс: сяляне, паны, папы, гандляры, злодзеі і г.д. Творы часта маюць выразна дыдактычны характар з высмейваннем негатыўных рыс паводзін людзей.

У творы П. Васючэнкі сюжэт таксама пабудаваны на шэрагу парадаксальных, часта анекдатычных здарэнняў (поліўка з ботаў, недарэчная дзяльба маёмасці, выседжванне яйка панамі і да т.п.). Пры гэтым многія з сітуацый, хоць і недарэчныя, але магчымыя ў жыцці. Цэнтральнымі персанажамі з'яўляюцца паны і сяляне, сустракаюцца таксама і гандляры, акторы і пад. Характарыстыка паноў як лянівых, фанабэрыстых, дурных у цэлым адпавядае фальклорнай.

б) Чарадзейныя (чарадзейна-фантастычныя) казкі – жанр, заснаваны на міфапаэтычнай фантастыцы, для якога характэрны звышнатуральныя вобразы (Цмокі, чараўнікі і г.д.), магічныя дзеянні і інш. У падобных творах выкарыстоўваецца асаблівая структура сюжэту, тыпы вобразаў-персанажаў, локусаў і рэчаў, спецыфічныя ўстойлівыя маўленчыя формулы і г.д.

З дадзенага жанру ў творы "Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі" назіраецца вобраз Цмока і яго маткі (хоць яна тут не Змяіха, як у фальклоры, а Кура Шчабятура), Кіта Велярыба, што плавае "за трыдзевяць зямель", Калінавага маста (на якім, як і ў чарадзейных казках, героі сустракаюць Цмока), дзівоснага насення, з якога вырастаюць дрэвы з кілбасамі, булкамі, рознымі прысмакамі замест пладоў і інш. Сама формула *жылі-былі*, ужытая ў назве твора, характэрная менавіта для чарадзейных казак.

в) Анімалістычныя казкі (казкі пра жывёл) – жанр фальклорнай казкавай прозы, у якім цэнтральнае месца займаюць вобразы жывёл, што з'яўляюцца галоўнымі героямі і ўбіраюць у сябе ўласцівасці як сапраўдных звяроў, птушак, так і людзей. Людзі ў дадзеных казках таксама часам прысутнічаюць, і жывёлы ўступаюць з імі ў пэўныя стасункі, у тым ліку могуць размаўляць.

У казачнай аповесці П. Васючэнкі таксама сустракаецца шмат вобразаў жывёл, якія маюць чалавечыя рысы і пэўным чынам кантактуюць з людзьмі. Напрыклад, у главе "Дзяльба" паны імкнуцца падзяліць паміж сабой нават маленькае мышаня, якое "спрабуе абразуміць паноў" [1, с. 26] і кажа ім: "*Ці, панове блёкату аб'еліся? Я ж панам не лава і не печ. Мне ж, можа, таксама жыць хочацца*" [1, с. 26]. Ослік у главе "Конь Божы" паказаны як рэфлексуючая істота, для якой характэрна задуменнасць, роздумы пра мінулае і пра Ісуса Хрыста, а таксама жаданне спяваць. Кот Буркун увогуле нібыта носіць вопратку ("чорны храк з белым гальштухам" [1, с. 77]), кіруе мышамі як генерал, кахае прыгожую котку і грае ёй на мандаліне.

Такім чынам, у творы "Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі" мы бачым элементы з усіх асноўных жанраў народных казак, якія таленавіты пісьменнік здолеў аб'яднаць у новую, цікавую сістэму. Падобнае змяшэнне жанраў увогуле характэрна для літаратурных казак, асабліва з часоў рамантызму.

Твор П. Васючэнкі абазначаны аўтарам як "казачныя аповесці" і такая характарыстыка, сапраўды, у цэлым падыходзіць да яго. "Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі" мае многія рысы як народных казак розных жанраў, так і непасрэдна літаратурнай казкі. Прычым, аўтарскія казкі як жанр можна падзяліць на тры групы паводле суадносін з казкамі фальклорнымі: творы з амаль поўным запазычаннем сюжэту, вобразаў і іншых элементаў з народных казак; творы з частковым запазычаннем; творы, што амаль не падобныя да фальклорных [7]. У гэтым плане "Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі" адпавядае другому з адзначаных тыпаў.

ЛІТАРАТУРА


1. *Васючэнка, П.* Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі: казач. аповесці : для сярэд. шк. узросту / П. Васючэнка; маст. У. А. Лукашык. – Мінск: Маст. літ., 2003. – 103 с.
2. *Гаврилов, Д. А.* Трюкач. Лицедей. Игрок. Образ трикстера в евроазиатском фольклоре / Д. А. Гаврилов. – М. : Ганка, 2009. – 288 с.
3. Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі / рэд. В. К. Бандарчык / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Беларус. нар. творчасць. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 496 с.
4. *Костюхин, Е. А.* Типы и формы животного эпоса / Е. А. Костюхин. – М. : Наука, 1987. – 271 с.
5. Сацыяльна-бытавыя казкі / рэд. В. К. Бандарчык / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Беларус. нар. творчасць. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 520 с.
6. *Фядосік, А. С.* Сацыяльна-бытавыя казкі // Народная проза / А. С. Фядосік, К. П. Кабашнікаў, А. В. Цітавец ; навук. рэд. А. С. Ліс. – Мінск : Бел. навука, 2002. – С. 296–371.
7. *Шамякіна, С.* Беларуская літаратурная казка // Полымя. – 2008. – № 8. – С. 92–97.
8. *Юдин, Ю. И.* Дурак, шут, вор и чёрт : Исторические корни бытовой сказки / Ю. И. Юдин // сост. и отв. ред. В. Ф. Шевченко. – М. : Лабиринт, 2006. – 336 с.